# Абуджаць любоў да жывога…



Лёс кожнага чалавека непарыўна звязаны з прыродай. Мы ўвесь час, самі таго не заўважаючы, жывём у цеснай сувязі з яе прыгажосцю, з яе краскамі і фарбамі. Раслінны і жывёльны свет, дождж і снег, град і вецер — колькі ўсяго пераплятаецца і дае падставы для роздуму і асэнсавання не толькі вонкавых карцінак, не толькі з'яў што паўстаюць перад нашымі вачыма... Уражанні ад сустрэчы са светам прыроды — гэта і аснова для развагаў, думак, для трывог і сумненняў...

Нездарма ў значнай ступені назіранні за прыродай станавіліся і працягваюць заставацца асновай, важнай крыніцай літаратурнай, музычнай, увогуле мастацкай творчасці. Але ёсць прафесіяналы ў справе назірання за прыродай. Ёсць вучоныя, чый досвед дазваляе пасля творчым людзям, ды і ўсім тым, хто захоплена ўглядаецца ў лес ці раку, горы альбо раўнінныя палеткі, адкрываць для сябе жыццё жывёл і раслін, дазваляе дасведчана меркаваць пра тыя ці іншыя з'явы ў наваколлі...

Адзін з такіх легендарных рупліўцаў — наш зямляк Дзмітрый Нікіфаравіч Кайгародаў. Ён нарадзіўся ў Полацку 31 жніўня 1846 года. У наступным годзе — юбілей: 170 гадоўздня нараджэння палачаніна, аднаго з самых дасведчаных фелолагаў Расіі, аднаго з самых актыўных папулярызатараў прыродазнаўства.

Бацька Дзмітрыя Кайгародава — генерал-маёр рускай арміі Нікіфар Іванавіч Кайгародаў — выкладаў матэматыку ў Полацкім кадэцкім корпусе. Туды паступіў і яго сын. Да сярэдзіны 1870-х гг. у войску служыў і Дзмітрый. У 1868-м, не пакідаючы службы, ён становіцца вольным слухачом Пецярбургскага земляробчага інстытута. Закончыўшы курс на лясным факультэце, Кайгародаў зацвярджаецца ў званні кандыдата. На наступны год Дзмітрыя Нікіфаравіча пераводзяць у Корпус лясніčых і камандзіруюць на два гады для ўдасканальвання ведаў, набыцця больш шырокага прафесійнага вопыту ў Германію, Аўстрыю, Швейцарыю, Швецыю і затым у Францыю. Зайздросная навукова-практычная камандзіроўка!

Вярнуўшыся на радзіму, Кайгародаў пачынае чытаць лекцыі ў Земляробчым (з 1881 гэта — ужо Лясны) інстытуце. Лясная тэхналогія, інжынернае мастацтва — вось кола захапленняў маладога выкладчыка, а ў хуткім часе прафесара, потым памочніка дырэктара інстытута. Працаваў у Лясным інстытуце Кайгародаў да 1905 года і звольніўся па ўласным жаданні. Ва ўсе гады сваёй выкладчыцкай і навуковай працы ён займаўся папулярызацыяй, шмат пісаў з разлікам на юнага чытача. Нядаўна мне трапіла на вочы перавыдадзеная ў Санкт-Пецярбургу ў 2006 годзе кніга “З царства птушак” (на тытульным лісце: "Рэкамендавана Рэгіянальным экспертным саветам Камітэта па адукацыі да выдання і выкарыстання ў адукацыйных установах Санкт-Пецярбурга ў якасці дадатковай вучэбнай літаратуры”). Першае выданне гэтай ёмістай, насычанай актуальным і зараз матэрыялам, кнігі — 1893 год. У 1908 годзе было зроблена ўжо чацвёртае выданне. Чытаем з прадмовы “Ад аўтара да першага выдання”: “Гэтая кніга змяшчае ў сабе шэраг нарысаў пра жыццё рускіх птушак сярод рускай прыроды. Я пісаў галоўным чынам пра тых птушак, якіх сам добра спазнаў, і сназнаўшы, сардэчна палюбіў. Гэта галоўным чынам насельніцтва нашых садоў, палёў і лясоў, пра якое гаворыцца ў гэтай кнізе; яно найболей часта трапляецца на



вочы чалавеку, а таму і найболей назіральнае.

Мэта гэтай кнігі — абудзіць у рускай публіцы (як юнай, так і дарослай) інтарэс да Птушынага царства і даць ёй магчымасць бліжэй пазнаёміцца з групай жывых істот, поўных цікавасці, прыгажосці і паэзіі, — істот, якія не толькі ўпрыгожваюць нашу прыроду, але і аказваюць нам часам вельмі і вельмі сур’ёзныя паслугі...”




Як адзін з найпапулярнейшых педагогаў Пецярбурга Дзмітрый Нікіфаравіч выкладаў прыродазнаўчую гісторыю вялікаму князю Міхаілу Аляксандравічу, а ў 1893-1899 гг,— вялікай княгіні Вользе Аляксандраўне. Затым — дзецям вялікага князя Канстанціна Канстанцінавіча. Кайгародаў быў адным з заснавальнікаў Рускага таварыства аматараў светазнаўства. Арганізаваў яго феналагічную секцыю. Дарэчы, з 1871 года і да канца свайго жыцця наш зямляк вёў феналагічныя запісы ў ваколіцах Пецярбурга. Кайгародаў склаў феналагічную карту прылёту птушак.

Вучоны-прыродазнаўца ва ўсе гады свайго жыцця чытаў лекцыі па арніталогіі, выступаў перад народнымі аўдыторыямі ў Педагагічным музеі ваенна-навучальных устаноў. А першая лекцыя Кайгародавым была прачытаная на Охцінскім парахавым заводзе. І называлася яна “Пра кветку як крыніцу асалоды”.

Некаторыя лекцыі пасля апрабацыі перад слухачамі вучоны выпускаў асобнымі невялікімі кнігамі, напрыклад “Нашы зімовыя госці-птушкі”, “Пра даўганогіх і даўганосых птушак”. “Гутаркі пра рускі лес”, якія ўпершыню пабачылі свет у 1880-1881 гг., вытрымалі дзевяць выданняў, “Пра нашых пералётных птушак” — 10. “З царства птушыных” — 6 выданняў. І такіх прыкладаў нямала. Толькі “Каляндар пецярбургскай вясны” прыходзіў да чытача ажно 15 разоў!..

Дарэчы, Дзмітрый Нікіфаравіч праявіў сябе і рацыяналізатарам, і вынаходнікам. Ён займаўся выпрабаваннем тэхнічных сродкаў драўніны, пытаннямі ляснога таваразнаўства, сухой перагонкі дрэва. За вынаходніцтва прыбора для вызначэння цвёрдасці драўніны і складанне першага ў Расіі “Рускага тлумачальнага лесатаварнага слоўніка” ў 1883 годзе быў адзначаны прэміяй Спецыяльнага Ляснога камітэта.

Вельмі шмат працаваў Кайгародаў як папулярызатар з разлікам на дзіцячую, школьную аўдыторыю. У 1901 годзе міністэрствам народнай асветы была зацверджана праграма прыродазнаўства для першых трох класаў сярэдняй школы, складзеная вучоным. У цэнтры ўвагі былі не столькі прадметы прыродазнаўчага цыкла — біялогія, батаніка, заалогія і г.д., колькі “інтэрнаты прыроды”, гата значыць прыродныя суб’екты: лес, сад, луг, возера, рака. Вывучэнне кожнага аб’екта доўжылася тры першыя класы. Гэты вопыт Кайгародаў узяў на ўзбраенне ў нямецкага педагога Філіпа Юнге. Вывучэнне прыроды рэкамендавалася праводзіць падчас экскурсій і вандровак са школьнікамі. Як мне падаецца, дык нічога дрэннага ў гатым няма. Але знайшлося шмаг крытыкаў такіх кайгародаўскіх падыходаў за ідэалістычны ўхіл у трактоўцы з’яў прыроды. І, пэўна ж, дарэмна. Як іначай абуджаць “пачуццё прыроды”, калі не ідэалізаваць сувязь чалавека з наваколлем, калі не ствараць прыгожы вобраз жывёльнага і расліннага свету?!.

Памёр Дзмітрый Нікіфаравіч Кайгародаў у 1924 годзе. Паспеў выдаць яшчэ амаль напрыканцы жыцця брашуру “Пра школьныя феналагічныя назіранні”. Улюбёны ў навакольнае асяроддзе вучоны, ён і зараз прыцягвае ўвагу сваімі кнігамі, літаральна кожная з якіх вартая перавыдання.

***Максім РАЎНАПОЛЬСКІ***

**Источник:** Родная прырода. — 2015. — №7. — С.62-63.